УДК [069.51:904]М. Тышкевіч

**А. М. Мароўская,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск*

# ЕГІПЕЦКАЯ КАЛЕКЦЫЯ МІХАЛА ТЫШКЕВІЧА

У артыкуле даюцца звесткі пра прадстаўнікоў роду Тышкевічаў, якія мелі калекцыі кніг, жывапісу, зборы старажытных артэфактаў. Разглядаецца археалагічная дзейнасць графа Міхала Тышкевіча. Даецца апісанне калекцыі егіпецкіх старажытнасцей, здабытых графам падчас падарожжаў у Егіпет.

**Ключавыя словы:** калекцыя, егіпецкія старажытнасці, каталог, музейныя прадметы.

**A. Narouskaya**
*Candidate of Historical Studies, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk*

# THE EGYPTIAN COLLECTION OF MICHAEL TYSHKEVICH

The article provides information about the representatives of the Tyszkiewicz family, who had collections of books, paintings and ancient artifacts. The archaeological activity of Count Michal Tyszkiewicz is considered. A description of the Egyptian antiques collection obtained by the count during his travels to Egypt is given.

**Key words**: collection, Egyptian antiques, catalogue, museum items.

Калекцыя (ад лац. collectio – збіранне, збор) – збор якіх-небудзь прадметаў або твораў мастацтва (кніг, карцін, культавых прадметаў і г. д.), аднастайных або аб'яднаных агульнай тэмай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калекцыяніраванне атрымала шырокае развіццё ў эпоху Адраджэння. У XIX ст. сярод найбольш вядомых калекцый – зборы Радзівілаў, Сапегаў, Тышкевічаў (галоўным чынам егіпецкая і антычная калекцыя Міхала Тышкевіча) і інш. Большая частка калекцый на сённяшні дзень знаходзіцца па-за межамі Беларусі.

Запал да гісторыі, музыкі і мастацтва праяўлялі многія прадстаўнікі лагойскай лініі Тышкевічаў, а таксама іх малодшай валожынскай лініі. Граф Пій Тышкевіч у Лагойскім палацы меў бібліятэку ў 3 тыс. тамоў, значную калекцыю італьянскага жывапісу, збор старажытных артэфактаў. Сыны Пія – Яўстахій і Канстанцін – былі захоплены гісторыяй і археалогіяй [2; 3]. Дзякуючы іх энтузіязму ў сярэдзіне 1850-х гг. у Вільні адкрыўся першы публічны музей старажытнасцей.

Прадстаўнік валожынскай лініі Бенедыкт Тышкевіч таксама з'яўляўся вядомым калекцыянерам. У яго маёнтку Чырвоны Двор (суч. Раўдондварыс, недалёка ад г. Каўнаса) была хатняя бібліятэка, якая ўключала мноства рэдкіх старажытных выданняў. Згодна літаратурным крыніцам, у калекцыі жывапісу былі палотны Леанарда да Вінчы, Рубенса і Караваджа. На вялікі жаль, у гады Першай сусветнай вайны маёнтак у Чырвоным Двары быў разрабаваны.

Міхал Тышкевіч у сваім маёнтку ў Астрашыцкім Гарадку таксама меў унікальную калекцыю жывапісных палотнаў старых майстроў (Рафаэль, Гальбейн, Босх і інш.). Але самай цікавай калекцыяй М. Тышкевіча была калекцыя егіпецкіх і антычных старажытнасцей, здабытых ім падчас падарожжаў у Егіпет і Італію. Значную колькасць антычных скульптур, керамічных вырабаў, камей і манет калекцыянер набыў у антыквараў. Пасля ад'езду М. Тышкевіча ў 1862 г. у Італію Астрашыцкі палац страціў значэнне культурнага цэнтра.

Ёсць дакладныя звесткі аб егіпецкіх калекцыях Віленскага публічнага музея старажытнасцей і аб тым, што ў прыватных музеях Тышкевічаў у Лагойску, а таксама іншых маёнтках Тышкевічаў у Беларусі і Літве, утрымоўваліся ўнікальныя старажытнаегіпецкія прадметы, якія падарыў сваякам Міхал Тышкевіч. Менавіта гэта калекцыя егіпецкіх і антычных артэфактаў набыла агульнаеўрапейскую вядомасць, а сам граф лічыўся буйнейшым спецыялістам у галіне старажытнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міхал Тышкевіч нарадзіўся ў 1828 г. у Валожыне ў сямейным маёнтку свайго дзеда, у гонар якога і быў названы. У маладосці граф вельмі захапляўся паляваннем і спецыяльна ездзіў у Афрыку на паляванне на ільвоў і пантэр.

У 1861 г. Міхал Тышкевіч адправіўся ў чарговае падарожжа ў Егіпет. У Каіры расійскі консул прадставіў графа Тышкевіча егіпецкаму віцэ-каралю Махамеду Саід-пашу, які падарыў яму фірман, спецыяльны ліст, для палягчэння вандроўкі ў Нубію. Але разам з фірманам граф М. Тышкевіч атрымаў дазвол на правядзенне археалагічных раскопак на ўсёй тэрыторыі Егіпта. Літаральна на наступны дзень, наняўшы землякопаў, М. Тышкевіч прыступіў да раскопак у раёне Карнакскага храма. У першыя дні раскопак ён знаходзіць пазалочаную пасудзіну і залатую фігурку Амона-Ра.

Гэтыя знаходкі яшчэ больш надалі імпэту графу. І калі егіпецкія ўлады забаранілі М. Тышкевічу працягваць раскопкі, граф, даўшы хабар мясцовым чыноўнікам, працягваў раскопкі ў Заходніх Фівах. У дзённіку падарожжаў (Парыж, 1863 г.) ён напісаў: «Нягледзячы на пакуты сумлення, я ўсё ж пачаў раскопкі. Страсць да старажытнасцей перадужыла, і зараз я знаходжуся ў нецярпенні ўбачыць муміі і саркафагі».

У выніку археалагічных раскопак Міхал Тышкевіч знайшоў дзве муміі і неразрабаваную грабніцу з вялікай колькасцю каштоўных артэфактаў. Сярод іх былі прадметы старажытнага побыту, рэлігійнага культу, папірусы.

Метады, якія выкарыстоўваў граф М. Тышкевіч, былі навукова абгрунтаванымі. Знаходкі замалёўваліся, усе прадметы прайшлі атрыбуцыю. Верагодна, што граф М. Тышкевіч быў знаёмы з методыкай правядзення археалагічных раскопак сваіх лагойскіх сваякоў Яўстафія і Канстанціна Тышкевічаў, якія заклалі падмурак айчыннай археалогіі.

224 артэфакты, прывезеныя Міхалам з Егіпта, з 11 сакавіка па 11 красавіка 1862 г. былі перададзены ім у Віленскі музей старажытнасцей.

У 1885 г. быў выдадзены «Каталог предметов Музея древностей, состоящего при Виленской публичной библиотеке». Асобна ў каталозе старажытнасцей вылучаюцца музейныя прадметы з Егіпта.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аддзел «Егіпет» [2, с. 37–38] быў прадстаўлены прадметамі «аддаленай старажытнасці», знойдзеных у катакомбах і пірамідах. Плошча Музея не дазволіла размясціць музейныя прадметы ў тым парадку, у якім яны ідуць у каталозе, але было зроблена ўсё магчымае дзеля таго, каб было зручна публіцы. З гэтай мэтаю зрабілі перад кожным раздзелам кароткія тлумачэнні, якія прызначаліся для тых наведвальнікаў, якія па сваіх занятках альбо становішчы не мелі звестак, неабходных для агляду калекцыі Музея.

У тэксце пішыцца, што прадстаўленыя прадметы не маглі даць поўнага разумення аб побыце таго альбо іншага народа. Але калекцыя магла пазнаёміць наведвальнікаў з жыццём народаў, «далёкіх і па сваёй гісторыі і па сваёй цывілізацыі».

Найбольш цікавыя звесткі па раздзеле «Егіпет» можна знайсці ў каталозе [2, с. 38–39]. У прыведзеным спісе даецца такая нумарацыя прадметаў, якая даецца ў каталозе. Спіс прадметаў егіпецкіх, падараваных Міхалам Тышкевічам Віленскаму музею старажытнасцей:

2–3. Дзве маленькія муміі дзяцей.

4–16. Трынаццаць маленькіх каменных статуэтак розных егіпецкіх боствaў.

17–18. Два маленькія жалезныя ідалы.

19–20. Два егіпецкія бажкі, знойдзеныя пры раскопках Марыета ў 1863 г.

21–232. Амулеты з каменя і з абпаленай гліны, якія носяцца разам з каралямі на шыі. Яны складаюцца з малюнкаў розных жывёл і казурак, і афарбаваны ў розныя колеры; усіх іх 212 штук.

233. Каралі з рознакаляровага бісеру з абпаленай гліны, з двума амулетамі.

34–238. Пяць шкляных слязніц з егіпецкіх катакомбаў.

239–240. Дзве слязніцы з гліны.

241. Гліняны гаршчок з катакомбаў.

242. Гліняны збан з вузкай прадаўгаватай шыйкай; адтуль жа.

243–247. Пяць гліняных лямпаў.

248. Алебастравая лямпа.

249. Кавалачкі папірусу, пакрытага пісьмёнамі і рознымі фігурамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

250. Каменны інструмент для прасавання папірусу ў выглядзе двух складзеных пальцаў.

251–254. Чатыры каменя з егіпецкіх пірамід.

255–256. Два высушаных маленькіх кракадзіла; адтуль жа.

Усе прадметы гэтага аддзела, за выключэннем № 1, 19–20, падораны графам Міхалам Тышкевічам [1, с. 37–38].

Каля 200 егіпецкіх артэфактаў граф Міхал Тышкевіч падарыў у Луўр. Шчодры дар Францыі быў неадназначна ўспрыняты на радзіме. Аднак у гэтага рашэння была бясспрэчная логіка. У лісце свайму траюраднаму дзядзьку Канстанціну Міхал пісаў: «Я патраціў столькі сіл і працаваў не дзеля задавальнення, але дзеля навукі. Мае знаходкі, калі іх прывезці ў Літву, дзе ніхто не ведае іерогліфаў, стануць проста пацешнымі штучкамі. У той жа час, дай іх у рукі сучасным Шампальёнам, і яны паслужаць дзеля навукі».

Згодна тастаменту, калекцыі Міхала Тышкевіча пасля яго смерці былі распрададзены на аўкцыёне ў Парыжы (1898). Сёння прадметы гэтых калекцый можна ўбачыць у экспазіцыях Брытанскага музея, Луўра, музеяў Берліна і інш.

---

*1.* Каталог предметов Музея древностей, состоящего при Виленской публичной библиотеке. – 2-е изд. – Вильна, 1885 г. – 272 с.

*2. Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

*3.* О курганах в Литве и Западной Руси (археологические исследования) Гр. К. Тышкевича, члена разных ученых обществ. – Вильна : Тип. А. К. Киркора, 1865. – 141 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ